*Генадзь Лапацін*

## З ВОПЫТУ ВЫВУЧЭННЯ ЗАМОЎ НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ. ЛЕКАВЫЯ ЗАМОВЫ

Адным з накірункаў экспедыцыйнай працы Веткаўскага музея стараабраднiцтва і беларускай культуры імя Ф.Р. Шклярава з’яўляецца фіксацыя і збор этнаграфічных і фальклорных тэкстаў. Не апошняе месца паміж апошніх займаюць замовы. Функцыянальны склад тэкстаў, зафіксаваных у азначаным рэгіёне, дастаткова разнастайны: гэта — замовы гаспадарчыя (у асноўным — жывёлагадоўчыя, у адзінкавых выпадках — земляробчыя), любоўныя, сацыяльныя (на суд), тэксты, што ўплываюць на ўзаемаадносіны са звышнатуральнымі сіламі. І асаблівае месца ў рэпертуары знаўцаў замоў займаюць тэксты, адмыслова накіраваныя супраць хвароб і хваравітых станаў. І гэта зразумела. Некаторыя з хвароб, напрыклад, такія як скула, рожа, ячмень, а таксама хваравітыя станы, якi ўзнiклi ў чалавека ў вынiку ўкуса змяі, суроку, пярэпалоху — увогуле, па ўяўленнях носьбітаў традыцыі, можна выправіць толькі з дапамогай «шоптаў». Намі запісаны аповеды пра тое, як самі ўрачы ў пэўных выпадках раілі хвораму «шукаць бабку», а таксама аповеды пра жанчын, да якіх «з’язжаліся с усіёй акругі людзі» [1].



*Малюнак 1* – Аўтар з З Варварай Аляикнсадраўнай Грэцкай, 2005 год

Як сведчаць аповеды носьбітаў традыцыі, і для іх гэта ў вышэйшай ступені істотна, лекавыя замовы прайшлі выпрабаванне часам. А таксама вызначальна тое, што іх плённасць яны адчулі на сябе саміх. У гэтым плане цікавым падаецца наступны аповед: «Сына я жаніла... І купіла сахара на гарэлку... На лісапете прывязла... І што мне лісапету паставіць, сняць той сахар... А я ўзяла, як падняла яго чэраз лісапету... Жывот сарвала... Эта называіцца «залатнік». Я ўжэ свадзьбу ня дзелала... Дзелалі другія... Работала я ў бальніцы... Там бабка ляжала із Засельля... Дак я ёй пажалілась, хтось мне сказаў... Дак яна і кажа: «Давай, я табе палячу на гарэлцы ці на віне...» Я кажу: «Хоць у міне свадзьба ўжэ і прашла, ну, дамоў жа мне нада іццi за этым... Папробуйце мне на чаю...» Яна палячыла... Мне трошкі легчэ... Яна назаўтра пашла, парынясла ёй віна... Яна мне на віне... Яна стала расказываць: «Дзетка, мы так спасаліся ў вайну... То цягалі салому, то сена... Ношку навяжыш, чэраз сілу возьміш... Дамоў прыдзіш, ужэ пачынаіш лячыцца...» Ну, і яна мне памагла... Я кажу: «Ну, спяшы мне...» Яна спісала...» [2].

У лекавых замовах захаваліся самыя старажытныя ўяўленні аб хваробах, згодна з якімі, хваробы падобны на чалавека і нават уступаюць паміж сабой амаль у людскія зносіны. У іх, як і ў людзей, ёсць свае родзічы і свае сем’і, яны ўступаюць у шлюб і маюць дзетак. Яны могуць быць рознага ўзросту. Як і ў людзей, у іх ёсць свая гаспадарка. Адсюль у замовах узнікае наступнае:

*«Каўтун-каўтунец, а ты, **добры маладец**, а ты, каўтуніца, **добрая маладзіца**, развівай гэты каўтун і сваіх дзяцей рассылай па ўсяму свету»* [3].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*«Скула-скулавіца,* ***красная дзявіца****, высылаю я цябе, выгаварыю...»* [4].

*«Скула-скулавіца, красная, ты* ***панская дзявіца****...»* [5].

*«Залатнік, залатнічок,* ***старыкоў старычок****, не хадзісь, не тамісь, вышэ пупа падымісь, стань на месце...»* (Ад грыжы) [6].

*«Сам ты, Вераней, ты, Вераніха,* ***дзеці вераняты****, ты сам выхадзі,* ***дзяцей*** *вывадзі...»* (Ад дзецкага) [7]

Разам з тым, у замовах у вышэйшай ступені празрыста акрэслена, што жывуць хваробы за межамі хрысціянскай прасторы.

*«...ідуць тры дзявіцы, Святы Отчэ Осіп спрашые: «Куды вы ідзіце?» — «У* ***мір хрысціянскі хрысціянскае цела*** *сушыць...»* (Ад кінцюхі). У адной з замоў гэтыя дзявіцы прызнаюцца, што яны *«**цара Ірада дочкі**»*. [8]

І нават калі хваробы не паказваюць сваё жывое аблічча, яны для выканаўцаў замоў застаюцца тымі самымі істотамі. У выканаўцаў замоў нават не ўзнікае сумнення ў тым, што хваробы размаўляюць з людзямі на адной мове. Таму выканаўцы замоў альбо ўступаюць з хваробамі ў дыялогі, альбо трымаюць перад імі маналогі, у якіх хваробы выгаворваюць, вымаўляюць, пагражаюць ім.

Захаваліся ў замовах і іншыя старажытныя ўяўленні, згодна з якімі чалавек па сваёй структуры суадносіцца са структурай сусвету. Таму выканаўцы замоў адмыслова ствараюць карціны сусвету з нерэальнымі падзеямі, каб паказаць нерэальнасць пэўных падзей і ў арганізме чалавека:

*«Ёсць тры царыкі: адзін царык – дуб у полі, другой царык – ясны месяц на небі, трэці царык – камень на морі. Як етым царікам умесці ні сходзіцца, за цісовыя сталы ні садзіцца, вінных чар ні співаць, адзін аднаго па бацюшку ні абзываць, хлеба-солі ні з'ядаць, так у етага раба Божжага (ці у дзіценка, ці ў жэншчыны) грызі ні бываць, па касьцях ні хадзіць, касцей ні ламіць, бакоў ні закладаць, к сэрцу ні прылягаць, на лане ні ляжаць».* [9]

*«Царь-месяц на небі, царь-дуб у лесе, цар-камень на морі. Як этым тром царам уместа не сходзіцца, за сталом не садзіцца, так у етага чэлавека чорнай балезні не быць...»* (Ад чорнай балезні) [10].

*«У моры рак, у дубе чарвяк, у небі месяц. Як эцім тром умесці не збірацца, мед-гарэлку не піць, меж сабой не гаварыць, так у раба Божага зубам не балець...»*(Ад зубоў) [11].

**У рэдкіх варыянтах, каб станоўча паспрыяць на хворага чалавека, выканаўцамі замоў мадэлюецца карціна ўпарадкаванага сусвету: *«...як Давид небу закрепив, так уси персти станьте на мести...»* (Молитва от заболевание живата внизу) [12].**

Гэта вытлумачвае той факт, чаму у адпаведных сітуацыях у замовах звяртаюцца да дрэў. Практычна любое дрэва, што сустракаецца ў замовах, сімвалізуе сабой міфалагічнае Сусветнае дрэва, якое «можа суадносіцца з чалавекам».[13] Дрэва ў замовах большай часткай з'яўляецца рэалізацыяй уяўленняў пра сусветнае дрэва, якое можа супастаўляцца з чалавекам. Таму ў замовах узнікае наступнае: *«Папляваць на сучок: «Як этаму сучку не атрастаць, так у раба Божага грызі не бываць, крыві не паліць і сэрца не таміць». «У бані парацца, так эту боль удаляюць. Венік дзяржы над боллю, венік ліставы ілі драч: «Як етаму веніку на карані не стаяць, веткамі не махаць, карані не пускаць, лісцю не зелянець, так раба Божжаму (імя) наге не балець...» «Гаварыць на сучок: «Як етаму дубу на карані не стаяць, з корня не пускаць, так у етага младзенца (імя) у роце зубішча...»* (Ад грызі) [14]

Адпаведна ўзнікае і наступнае, станоўчае:

*«Каранёк-зелянок, не я цябе сам садзіў, сам Гасподзь садзіў, сам паліваў, усім людзям помачы даваў...»* (Ад усяго) [15]. *«У лесе на прыгорку стаіць сасна тонкая, высокая, лісцьем зялёная. І не баіцца ўлетку жары, узімку марозу, ні жаркага сонца, ні яснага месяца. Так раба Божая Матрона не баіцца ні ўрокаў...»* (Ад урока') [16]. Разам з тым, у лекавых замовах падаюцца і самыя рэальныя ўяўленні аб хваробах. Згодна з асобнымі тэкстамі, хваробы могуць быць вынікам дзейнасці ведзьмакоў альбо сурочлівых людзей. У тэкстах некаторых замоў прыводзяцца складнікі рэпертуара ведзьмаў, у якія могуць уваходзіць больш за сорак самых розных хвароб і хваравітых станаў.

Не застаюцца па-за ўвагай выканаўцаў замоў і пытанні дыягностыкі. Так адна і тая замова можа выкарыстоўвацца як ад пярэпалаху, так і ад сурокаў, што тлумачыцца наступным:

*«Гаворыш, штоб памагала. Можа, не іспуг, а можа, урок, а, можа, улёк, улякнуўся. Вот так і гаворыш. На што натрапіш, на што пападзе, еслі не іспуг, дак — урок, еслі не ўрок — дак улёк. Еслі не ўлёк — дак, можа, прастужаны, можа, паглядны, можа, уцешны, можа, пасмешны, хто пасмяяўся. Малітвачка адна».*[17]

Не менш цікавым падаюцца і наступныя тлумачэнні: *«...выгаварывая ўрок падумны, пагадны, урошны, уцешны, пасмешны...» Вот, эта вот, ці хто пасміецца, ці хто ўдзівіцца, напрымер вот, на міня: «Ой! Як іна!..» — падзівіцца».* [18] *«Якія вы, начніцы? Начныя, полуночныя, дзянныя, полудзёныя, пагадныя, пастрэшныя, пасмешныя, калючыя, балючыя, гаручыя, свярбучыя, чужы чужаніна і свайго сем'яніна. С усіх касцей, машчэй высылаю». Бывае ад чужога, а бывает ад свайго.[Гэта як?] Свой падумая, наша Гаша была ўрошная... Падумая, тады дзіцёнак ноч ні спіць».* [19]

Некаторыя з хвароб, згодна з замоўнымі тэкстамі, з'яўляюцца вынікам неасцярожных паводзінаў самога чалавека. У каментарах, якія робяць выканаўцы замоў, сустракаем наступнае: *«Вот інагда падыміце вы цяжола, і пака не пашэпчэш, і не дбавіш яго. Вот, яно і пішацца «ад падоймы». «Ета будзіце іцці, і, бывае, нялоўка станіце і звіхнеце нагу. Яно ні мінаецца. Яго нада прагаварываць».* [20]

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Жыхары нашых вёсак беспраблемна суадносяць народныя і навуковыя назвы і вызначэння хвароб і хваравітых станаў:

«*Як прыпадкі ў дзіцяці пачынаюцца, уродзе, як і не жыў — ета «дзецкае» называецца. Ціпер – эпілепсія*». [21]

«*Чорная балезнь – эта эпілепсія па-научнаму. І тады ўсе гаварылі, вот дапусцім, яна б'е чалавека, эпілепсія*». [22]

«*Дзяцінец. Ета не дай Бог! Ета — «чорная балезь» называіцца. Асобенна малыя дзеці хварэяць*». [23]

«*Улёкі, можа, хто спужаўся, а ўрокі – з вачэй становіцца. Цемянік — як урок удаўніцца, як спужаецца маленькі дзіценак, тут во ямачка, і цемцам б'ецца*». (Ад улёку) [24]

«*Уцён – спіна баліць. Ні сагнуцца. Радзікуліт – тэй самы*». [25]

Цікавым чынам выглядаюць уяўленні пра скулу: «*Вас ўсіх дзвенаццаць скул, дзвенаццаць паўскул, дзвенаццаць прышчыкаў, дзвенаццаць паўпрышчыкаў, бялуха, краснуха, сінюга, жаўтуха, жабіца, зябліца, нарытніца, карытніца, гарлянка, шарляцянка, заушніца, пад'язычніца, скула-рожа, скула-залатуха...*» [26] З аднаго боку, міфалагічныя ўяўленні аб хваробах як аб дванаццці сёстрах. З другога боку, асобнае ў гэтых вызначэннях супадае з вынікамі рэальных назіранняў над скулой, прынамсі: «*Яна зразу дзелаецца сіневатай, а тады чорная дзелаецца, тады — жоўтая дзелаецца, зразу — красная, закраснее ўсё цела...*» «*Вот красная опухаль, пачыная опухаль, а патом падымаіцца белая, гной начыная саздаваіцца сцержань, як жоўтая палучаіцца... дырачка... гной пашоў... Яна разрывая... Последняя стадзія — жоўтая. З белага жоўтая становіцца*». [27]

У шэрагу замоваў можна заўважыць лекавыя рытуалы, якімі рэальна карыстаюцца ў нашых вёсках.

«*Прачыстая мамка з мора ваду брала, рабу Божаму улёк змывала, чорнай рызай выцірала...*» Сувязь такога дзеяння з рэальным абрадам відавочная. Літаральна ў любой вёсцы, каб пазбавіць свайго дзіцёнка наступстваў сурокаў, са словамі «*Хто нарадзіў, той адхадзіў*» выцірaлі яго подалам сваёй кашулі.

«*Устану я рана-раненька. Умыюся бела-бяленька. Пайду я у чыстае поле. Найду дрэва-бярозку і стану сеч і рубіць. І ў етага раба Божжага цён выбіраць*». Як паказваюць нашы матэрыялы, у нашых вёсках насамрэч існуе абрад высяканьня цёну: «*Нада браць з веніка дзве галючкі, з бярозавага. Адну кладуць так, а другую наверх (крыжам — Г. Л.). Тады нож бярэ і сячэ: «Уцён, уцён, вазьмі мой уцён!» І сячэ. Не па целу сячэ, а па лазічке*». [28]

«*Шла Мать Божая па поли. Крыницу искала, с трох крыниц ваду брала, рабе Божай Екатерине помач давала*». У гэтай замове вызначальна тое, што ваду трэба браць з трох крыніц. Адпаведнае сустракаецца і па-за межамі замоў: «*...нада набраць з трох калодцаў вады, послі двенаццаці часоў ночы, штоб ніхто больш не браў...*» [29]

«*Грызь! Грызь! Не грызі! А то я цябе загрызу ваўчынымі зубамі, змяіным жалам..*» Адпаведнае таксама сустракаецца і па-за межамі замоў: «*У нас была на пасёлку... У мяне грыжа ў пупу была, так плоха была, і прывялі яе, яна пашаптала, і я кажу: «Ці ета я прыдурывалася?» Зразу... Яна пагрызла, пашаптала і ўсё атышло. [Што значыць: яна пагрызла?] Пуп тэй, што вылізла грыжа, дак яна тую грыжу пагрызла ротам і пашаптала, і ўсё і прайшло. І во да етых пор што аперацыю здзелалі мне, ні раз ні балела*». [30]

«*Што на этих трох дарогах стаить тры печи. Адна печ залезная, другая стальная, трэття каменная. Што в етых трох печах тры перапечники. Яны пякуть и перапякають рабу Божаю Екатерину, нервеную балезнь вынимают...*» (От нервов) [31] Абрад перапяканьня хворага таксама сустракаецца ў нашых вёсках.

Не засталося па-за ўвагай выканаўцаў замоў і выкарыстанне зёлак, прынамсі: «*...з моря карэнні вырывала, етаму младзенцу помачы давала....*» (Ад ўроку) [32]

Актыўна ў замовах выкарыстоўваюцца рэлігійныя сродкі, такія як асвечаныя вада і соль. За радкамі і вобразамі замоў лёгка прасочваецца, што выканаўцы замоў карыстаюцца вадой, асвечанай на Раство, Хрышчэнне, Макаўе (*Маць Прачыстая нісла келіш. У той келішы тры вады: ражвенская, ірданская, макаўская вадзіца*» [33], «*ірданскай вадой урокі ды прыгаворы ўспрысківаю*») [34]; і асвечанай ў чысты чацверг соллю ( «*...соллю сцірала, вадой прамывала...*»). [35]

У тэкстах замоў заўважана, што пры пэўных хваробах выканаўцы звяртаюцца па дапамогу да адных і тых жа святых: да св. Юрыя пры бяльме, да св. Самсона пры начніцах і г.д. У гэтым плане цікавым з'яўляецца зварот да свята «Уводзіны Багародзіцы ў Храм», які грунтуецца на пераасэнсаванні назвы свята: «*Светое Ведение, изгани (имя) с глаза правага и левага туску и бельмо*». [36]

Такім чынам, лекавыя замовы самадастаткова канцэнтруюць самыя living рознабаковыя народныя ўяўленні пра хваробы і іх лекаванне. У іх пераплятаюцца як самыя старажытныя міфалагічныя, так і практычныя веды і назіранні носьбітаў традыцыі.

**Спіс літаратуры:**


1. Лопатин, Г. «Ну ўсё раўно ты будзіш палезна людзям...» / Г. Лопатин // Живая старина. —2013. – № 1. – С. 36–38.
2. Ад ж-кі в. Цекляшы Гомельскага р. (родам з п. Прасвет Цярэнічскага с/с Шчадровай Зінаіды Аляксееўны, 1937 г. н. зап. Лапацін Г. І., Скідан А. В. у 2014 г. Сш. 139. (Стадыя дэшыфроўкі).


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. У тэкстах замоў, што цытуюцца ў гэтай публікацыі, асаблівасці мовы інфармантаў захоўваюцца. У тых выпадках, калі тэксты замоў былі скапіраваны з аркушаў альбо сшыткаў, захоўваюцца асаблівасці арфаграфіі і пунктуацыі.
4. Ад ж-кі в. Неглюбка Веткаўскага р. Барсуковай Лісаветы Аўрамаўны, 1912 г. н., зап. Чыжова І. Ю., Лявонцьева С. І. у 1989 г. Сш. 62. Ар. 17.
5. Ад ж-кі п. Навіны Веткаўскага р. Сычанковай Анастасіі Барысаўны, 1924 г. н., зап. Лапацін Г. І. у 2008 г. Сш. 127. Ар. 21.
6. Ад ж-кі в. Ліцвінавічы Кармянскага р. Казлоўскай Наталі Паўлаўны, 1930 г. н., зап. Лапацін Г. І., Раманава Л. Д. у 1999 г. Сш. 91. Ар. 119.
7. Ад ж-кі в. Ліцвінавічы Кармянскага р. Казлоўскай Наталі Паўлаўны, 1930 г. н., зап. Лапацін Г. І., Раманава Л. Д. у 1999 г. Сш. 91. Ар. 119.
8. Найбольш поўна гэтая тэма прааналізавана аўтарам у публікацыі: Лопатин, г. Мир заговора. Пространство пустое и полное // Чалавек. Культура. Экалогія : матэрыялы міжнар. навук. канф. / пад агул. рэд. праф. У. П. Скараходава. — Мінск : БелІПК, 1998. — С. 140–142.
9. Ад ж-кі в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р. Волкавай Еўдакіі Сямёнаўны, 1924 г. н., зап. Лапацін Г. І. у 1995 г. Сш. 52. Ар. 18–19.
10. Ад ж-кі в. Чыстыя Лужы Веткаўскага р. Куляшовай Аўдоцьі Раманаўны, 1924 г. н., родам з в. Пабеда (Шалухоўка), зап. Лапацін Г. І. у 1998 г. Сш. 52. Ар. 70.
11. Ад ж-кі в. Барталамееўка Веткаўскага р. Еціпнёвай Матроны Цітаўны, 1919 г. н., зап. Лапацін Г. І. у 1994 г. у Ветцы. Сш. 53. Ар. 1–2.
12. З лісткоў, што належаць п-кцы з в. Старае Закружжа Веткаўскага р. Кужэльнай Праскоўі Сяргееўны, 1933 г. н., дагэтуль належылі свякрусе Кужэльнай Параскеве Паўлаўне, 1901 — 1998(7), скапіраваў. Лапацін Г. І. у 2006 г. Сш. 121. Ар. 9.
13. Иванов, В. В. Славянская мифология / Иванов В. В., Топоров В. Н. // Мифы народов мира : энцикл. : в 2 т. – М. : Сов. энцикл., 1998. – Т. 2. – С. 451.
14. Гл. № 11. Ар. 25.
15. Ад ж-кі в. Бабічы Чачэрскага р. Радзькоўскай Наталлі Ягораўны, 1929 г. н., зап. Лапацін Г. І. у 1998 г. Сш. 75. Ар. 35.
16. Гл. № 11. Сш. 53. Ар. 54.
17. Ад п-кі з в. Сівенка Веткаўскага р. Дзеравяшкінай Марыі Ягораўны, 1927 г. н., зап. Лапацін Г. І. у 2006 г. у Ветцы. Сш. 60. Ар. 33.
18. Ад ж-кі в. Хальч Веткаўскага р. Воінавай Таццяны Клімаўны, 1926 г. н., зап. Лапацін Г. І. у 2009 г. Сш. 135. Ар. 22.
19. Гл. № 5. Ар. 23-24.
20. Ад ж-кі в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р. Волкавай Еўдакіі Сямёнаўны, 1924 г. н., зап. Лапацін Г. І. у 1995 г. Сш. 52. Ар. 23.
21. Ад ж-кі в. Ліцвінавічы Чачэрскага р. Бураковай Раісы Пятроўны, 1941 г. н., зап. Лапацін Г. І., Раманава Л. Д. у 1999 г. Сш. 91. Ар. 60.
22. Гл. № 10. Ар. 70.
23. Ад п-кі з п. Амяльное Веткаўскага р. Грэцкай Варвары Аляксандраўны, 1925 г. н. зап. Лвапацін Г. І. у 2006 г., у Ветцы. Сш. 117. Ар. 93.
24. Ад ж-кі в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р. Суднека Ганны Яўсееўны, 1937 г. н., зап. Лапацін Г. І. у 1997 г. Сш. 52. Ар. 29.
25. Гл. № 10. Ар. 71.
26. Гл. № 10. Ар. 48.
27. Ад былога ж-ра п. Амяльное Векткаўскага р. Грэцкага Сяргея Сяргеевіча, 1950 г. н. зап. Лапацін Г. І. у 2010 г. Сш. 117. Ар. 274
28. Гл. № 10. Ар. 71.
29. Ад ж-кі в. Шарсцін Веткаўскага р. Раманцовай Алены Мікалаеўны, 1953 г. н., зап. Лапацін Г. І. у 2008 г. Сш. 126. Ар. 8.
30. Ад п-кі з п. Амяльное Веткаўскага р. Кушняровай Алены Барысаўны, 1927 г. н., зап. Лапацін Г. І. у Ветцы у 2011 г. Сш. 121. Ар. 44.
31. Са сшыткаў, што належаць ж-цы в. Данілавічы Веткаўскага р. Чуяшковай Кацярыне Еўдакімаўне, 1931 г. н., скап. Лапацін Г. І. 2008 г. Сш. 127. Ар. 37.
32. Ад ж-кі в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р. Хамяковай Феклы Дзянісаўны, 1906 г. н., зап. Лапацін Г. І. у 1996 г. Сш. 52. Ар. 31.
33. Гл. № 31. Ар. 37.
34. Ад ж-кі в. Навілаўка Веткаўскага р. Алесенка Аксіны Барысаўны, 1916 г. н., зап. Лапацін Г. І. у 1990 г. Сш. 70. Ар. 3
35. Ад ж-кі в. Хальч Веткаўскага р. Рыкавай Паліны Паўлаўны, 1929 г. н., зап. Лапацін Г. І., Раманава Л. Д. у 2001 г. Сш. 97. Ар. 24.
36. Гл. № 31. Ар. 37.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ